# УСТУП

Мастацкая літаратура выконвае важную ролю ў жыцці асобы, у фарміраванні яе адносін да свету. Гэтае ж уласціва і дзіцячай літаратуры. Перажываючы разам з героямі твораў пэўныя жыццёвыя сітуацыі, маленькі чытач набывае адпаведны сацыяльны вопыт. Даверлівыя адносіны дзіцяці да кнігі адкрываюць перад настаўнікам шырокія магчымасці фарміравання асноў светаўспрымання, маральнага і эстэтычнага выхавання падрастаючага пакалення.

Згодна з адзначаным вышэй, вучэбнай дысцыпліне "Беларуская дзіцячая літаратура" адводзіцца асобае месца ў сістэме падрыхтоўкі настаўніка пачатковай школы. Дзіцячая літаратура з'яўляецца часткаю літаратурнага працэсу. Многія тэндэнцыі, якія характарызуюць развіццё літаратуры ў цэлым на пэўным этапе, вызначальныя і для дзіцячай літаратуры.

Вучэбная дысцыпліна "Беларуская дзіцячая літаратура" абапіраецца на веды, атрыманыя ў працэсе засваення педагогікі і псіхалогіі, якія даюць уяўленне пра ўзроставыя асаблівасці, зацікаўленасці дзяцей, дапамагаюць зразумець, як будзе ўспрымацца імі той ці іншы твор, спрыяюць спасціжэнню спецыфікі ўнутранага свету і матывацыі дзеянняў і ўчынкаў герояў кніг.

Веды па сучаснай беларускай мове даюць магчымасць адчуць багацце моўнага афармлення мастацкага твора, яго стылю, убачыць інструменты стварэння мастацкіх вобразаў.

Вывучэнне літаратурных з'яў немагчыма без ведання гістарычных працэсаў, бо прыгожае пісьменства ўяўляе сабой суб'ектыўна-вобразную карціну гісторыі развіцця чалавецтва. Мастацкі твор дастаткова часта дапамагае ўявіць пэўную эпоху, растлумачыць зварот пісьменніка да той або іншай тэмы ці вобраза.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Вучэбная дысцыпліна "Беларуская дзіцячая літаратура" звязана з методыкай выкладання беларускай мовы і літаратуры.

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны "Беларуская дзіцячая літаратура" – "сфарміраваць у навучэнцаў уяўленне аб дзіцячай літаратуры як састаўной частцы беларускай літаратуры, яе галіне, даць паняцце аб асноўных этапах гісторыка-літаратурнага працэсу фарміравання беларускай дзіцячай літаратуры, тэматыцы дзіцячага чытання"[1].

Дасягненню гэтай мэты спрыяе вырашэнне наступных *задач*:

- фарміраванне ў навучэнцаў уменняў выкарыстання пры аналізе мастацкага твора асноўных тэарэтыка-літаратуразнаўчых паняццяў;
- фарміраванне ў будучых настаўнікаў пачатковай школы ўменняў ацэнкі ідэйна-эстэтычных вартасцей мастацкага твора;
- выпрацоўка ўменняў аналізу мастацкага тэксту з улікам спецыфікі дзіцячага ўспрымання;
- вызначэнне выхаваўчага і пазнавальнага патэнцыялу мастацкага твора ў адукацыйным працэсе;
- садзейнічанне выхаванню высокага эстэтычнага густу, развіццю самастойнага творчага мыслення навучэнцаў.

У літаратуразнаўстве сёння няма адзінага падыходу да разумення паняцця "дзіцячая літаратура". Некаторыя даследчыкі зусім не вылучаюць гэты напрамак мастацкай творчасці, падзяляючы літаратуру на "добрую" і "благую", або разглядаюць творы для дзяцей як адзін з відаў масавай літаратуры. Памыляюцца і першыя, і другія. Пазіцыя першых не адпавядае практыцы: любы чалавек у стане адрозніць, для каго прызначаны твор. Погляд другіх супярэчыць думцы большасці мастакоў слова, якія пісалі свае творы для дзяцей і адзначалі, што гэта рабіць ім было больш складана, чым пісаць для дарослых.

[1] Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне "Беларуская дзіцячая літаратура" прафесіянальнага кампанента тыпавога вучэбнага плана па спецыяльнасці 2-01 02 01 "Пачатковая адукацыя" для рэалізацыі адукацыйнай праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй / І.Г. Лабёнак. Мінск, 2014.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Дзіцячая літаратура – галіна мастацкай дзейнасці, якая ўключае ў сябе творы, напісаныя спецыяльна для дзяцей, а таксама творы, якія першапачаткова не ствараліся для дзяцей, аднак з цягам часу ўвайшлі ў кола дзіцячага і юнацкага чытання (напрыклад, зборнік "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях" Яна Баршчэўскага, паэма "Магіла льва" Янкі Купалы, асобныя раздзелы паэмы "Новая зямля" Якуба Коласа і інш.).

Гэтая частка літаратуры ўзнікае на скрыжаванні мастацкай творчасці і педагагічнай дзейнасці. Такой акалічнасцю абумоўлена і спецыфіка творчасці для дзяцей. Яна павінна адпавядаць узросту (узроўню ведаў, ступені інтэграцыі ў соцыуме), што абумоўлівае выбар відаў і жанраў гэтай спецыфічнай часткі літаратуры, яе тэматыку і праблематыку, паліграфічнае афармленне кнігі і інш.

Пры гэтым любое выданне для дзяцей заўсёды мусіць выконваць выхаваўчую і адукацыйную функцыі, паколькі асноўная мэта дзіцячай літаратуры – маральнае і духоўнае выхаванне, садзейнічанне гарманічнаму развіццю асобы, адкрыццё новага для дзяцей ў навакольным асяроддзі, ва ўзаемаадносінах паміж людзьмі.

Дзіцячая кніга спрые наладжванню моўнай камунікацыі: папаўняе слоўнікавы запас дзяцей, прапануе ўзоры маўленчых паводзін і моўнага этыкету. Творы мастацкай літаратуры дапамагаюць пераадолець пэўныя псіхалагічныя бар'еры ў міжасабовых зносінах.

Дзіцячая літаратура выконвае таксама і эстэтычную функцыю, бо кніга дае ўяўленне пра прыгожае, змяшчае прапедэўтычныя звесткі пра розныя мастацкія напрамкі і плыні, жанры, формы мастацкага твора, фарміруе эстэтычны густ.

Геданістычная функцыя (звязаная з эстэтычнай асалодай) з'яўляецца не менш важнай. Роля кнігі ў жыцці дзіцяці змянілася – яе выцясняюць сродкі масавай інфармацыі, IT-тэхналогіі і індустрыя віртуальных забаў (сацыяльныя сеткі, камп'ютарныя гульні і да т. п.), якія адмоўна ўплываюць на працэс чытання і яго вынікі: дзеці губляюць здольнасць да цэласнага ўспрымання твора, не могуць доўга сачыць за сюжэтам, не валодаюць навыкамі пераказвання, што ў сваю чар-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

гу не лепшым чынам адбіваецца на іх маўленні. Таму сёння перад настаўнікамі і бацькамі стаіць важная задача: навучыць дзяцей чытаць кнігу (не проста расшыфроўваць графічныя знакі, а ўвайсці ў яе мастацкі свет), паказаць ім узор здабывання эстэтычнай асалоды ад зносін з друкаванай ці электроннай кнігай, самастойнага аналізу і ацэнкі мастацкіх вартасцей твора, дзеянняў і ўчынкаў герояў. Гэта вельмі важна. Кніга прымушае фантазіраваць, уяўляць яе мастацкую прастору, спрыяе сацыялізацыі дзяцей.

*Характэрныя рысы твора дзіцячай літаратуры* наступныя: зварот да спецыфічнага рэцыпіента – дзіцяці; наяўнасць прадметнага, своеасаблівага (даступнага для рэцэпцыі) мастацкага вобраза; дынамізм развіцця сюжэту; багацце, эмацыйнасць і дакладнасць моўнага афармлення. Гэтыя прыметы, акрамя першай, безумоўна, уласцівыя і так званай літаратуры дарослай, але набываюць асобы статус у дзіцячым прыгожым пісьменстве, бо без іх твор не зможа карыстацца попытам сярод дзяцей.

Дзіцячая літаратура, выконваючы выхаваўчую і пазнавальную функцыі, таксама мае на мэце садзейнічаць фарміраванню жыццёвай пазіцыі чытачоў у адносінах да свету, крытэрыяў пэўных паводзін, эмацыйных уражанняў, адчуванняў і прадчуванняў. Гэтым мэтам садзейнічаюць разнастайныя спецыфічныя *жанры дзіцячай літаратуры*: загадкі, вершы, байкі, казкі, апавяданні, аповесці і інш.

Змест дзіцячай літаратуры быў заўсёды ў цэнтры ўвагі беларускіх мастакоў слова. Так, у пачатку XX ст., калі набіраў сілу адраджэнскі рух, такія пісьменнікі, як Цётка, Якуб Колас, Змітрок Бядуля і іншыя звярнуліся да творчасці для дзяцей. Гэта была частка праграмы стварэння новага – нацыянальна арыентаванага – чалавека. Цётка – неафіцыйны рэдактар аднаго з першых беларускіх часопісаў для дзяцей і моладзі "Лучынка" – у аднайменным вершы, які адкрываў першы нумар гэтага выдання, заяўляла, што літаратура для дзяцей не павінна мець сацыяльных межаў, яна мусіць адкрываць новыя прасторы для пазнання свету, "свяціць" для ўсіх. Якуб Колас у "Методыцы роднае мовы" (1926) адзначаў, што самы важны перыяд далучэння дзіцяці да скарбаў кніжнай культуры – гэта час навучання ў пачатковай школе.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

На неабходнасць пісаць для дзяцей проста, але не спрошчана звярнуў увагу Алесь Якімовіч: "*У Коласа я вучыўся пісаць – проста, ясна, без мудрагельства*"[1]. Ён жа ў сваім артыкуле "Праблемы сучаснай беларускай дзіцячай літаратуры" вылучаў самую вялікую загану твораў для малых чытачоў – адарванасць пісьменнікаў ад жыцця, іх нежаданне бачыць складанасць дзіцячай літаратуры, бо гэта такая ж частка слоўнага мастацтва, як і творчасць для дарослых.

Класік дзіцячай літаратуры Янка Маўр, які сам па адукацыі быў настаўнікам, лічыў, што без кнігі немагчыма выхаваць сапраўднага чалавека. Яго дачка Аляксандра Іванаўна Капылова ўспамінала: "*Самую вялікую ролю ў выхаванні дзяцей бацька адводзіў чытанню. Наш дом быў поўны кніг і часопісаў: у той час дамашняя бібліятэка бацькі лічылася адной з лепшых у горадзе.* <...> *Не было ні аднаго колькі-небудзь цікавага часопіса і дадатка да яго, якія не выпісваў бы бацька. Ніколі не забыць, з якой цікавасцю і нецярпеннем чакалі мы іх!*"[2].

Неацэнную ролю дзіцячага пісьменніка ў станаўленні асобы чалавека вызначыла Алена Васілевіч: "*Дзіцячы пісьменнік... Яму патрэбны сапраўдная адвага і, несумненна, вялікі талент. Бо, абраўшы сабе гэтае высокае званне, ён вымушаны як бы перад усім светам пацвердзіць: «Я пішу для дзяцей і тым самым бяру на сябе адказнасць быць іх настаўнікам і праваднікам у Краіну Нязведанага...» Праваднікам! А хто не ведае, як многа патрабуецца ад праваднікa?*"[3].

Васіль Вітка – стваральнік цікавай педагагічнай сістэмы, аўтар актуальных і зараз кніг для бацькоў і настаўнікаў "Дзеці і мы", "Азбука душы", "Урокі" – лічыў, што дзіцячая літаратура і педагогіка цесна паяднаны адной задачай выхавання сапраўдных людзей: "*Без душэўнай чуласці, без любові да дзіцяці не можа быць ні педагогікі, ні дзіцячай літаратуры. Педагогіка і літаратура – дзве родныя, неразлучныя сястры. Толькі пры іх цесным супрацоўніцтве і сяброўстве магчыма са-*

---

[1] Якімовіч, А. Збор твораў. У 3 т. Т. 3. Апавяданні, казкі, аўтабіяграфія / А. Якімовіч. Мінск, 1980. С. 472.

[2] Миронов, А. Дед Мавр : повесть-воспоминания / А. Миронов. Минск, 1983. С. 130.

[3] Васілевіч, А. Люблю, хвалююся – жыву : нататкі, эсэ, роздум / А. Васілевіч. Мінск, 1986. С. 225.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*праўднае духоўнае і эстэтычнае выхаванне дзяцей, фарміраванне чалавечай асобы*"[1].

Беларуская дзіцячая літаратура прайшла складаны і працяглы шлях. Яе зараджэнне звязана з творчай дзейнасцю такіх выдатных прадстаўнікоў беларускай культуры, як Мялецій Сматрыцкі, Сімяон Полацкі, Паўлюк Багрым, Ян Баршчэўскі, Ян Чачот, Адам Гурыновіч і шэраг іншых. На першым этапе свайго станаўлення (да XX ст.) беларуская дзіцячая літаратура існавала ў выглядзе дыдактычных вершаў, аповедаў, першых казачных твораў. Асаблівага росквіту дзіцячая літаратура дасягнула ў XX ст. Літаратуразнаўцы вызначаюць наступныя перыяды яе развіцця: 1920–1930-я гады, 1940–1960-я гады, 1970–1980-я гады і сучасны этап. Больш падрабязная характарыстыка перыядаў прадстаўлена ў адпаведных тэмах гэтага дапаможніка.

Кожны мастацкі твор разлічаны на пэўную ўзроставую групу: дашкольная, малодшая школьная, сярэдняя школьная (падлеткавая), старэйшая школьная, (юнацкая)[2]. Гэта дастаткова ўмоўны падзел, бо тут не бярэцца пад увагу такі важны фактар, як індывідуальныя асаблівасці дзіцяці, яго прыродныя схільнасці, ступень досведу і чытацкай культуры.

У малодшым школьным узросце адбываюцца карэнныя змены ў чытацкай культуры асобы: дзіця пастулова з катэгорыі "слухач" пераходзіць у катэгорыю "чытач". Маленькі чытач ужо можа самастойна падбіраць сабе мастацкія творы; ён таксама набывае навыкі выразнага чытання, перадаючы голасам настрой герояў, здольны выражаць свае адносіны да падзей. У гэты перыяд дзіця вучыцца працаваць з тэкстам: вылучаць у ім пэўныя эпізоды, складаць план і г. д.

Калі ўлічыць, што адной з асноўных характарыстык літаратурнага развіцця з'яўляецца ўспрыманне і разуменне мастацкіх вобразаў, то дзеці малодшага ўзросту ўспрымаюць і асэнсоўваюць тое, што чытаюць, на эмпірычным узроўні.

[1] Вітка, В. Урокі : артыкулы, выступленні, нататкі / В. Вітка. Мінск, 1982. С. 235.

[2] Алферов, А.Д. Психология развития школьников : учеб. пособие / А.Д. Алферов. Ростов н/Д, 2000; Волков, Б.С. Возрастная психология. В 2 ч. Ч. 2. От младшего школьного возраста до юношества / Б.С. Волков, Н.В. Волкова ; под ред. Б.С. Волкова. М., 2005; Возрастная и педагогическая психология / М.В. Матюхина [и др.] ; под ред. М.В. Гамезо [и др.]. М., 1984.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Кожны мастацкі вобраз, кожная дэталь упісваюцца імі ў навакольны прадметны свет.

Марыя Ваюшына вылучае чатыры ўзроўні дзіцячай рэцэпцыі мастацкага твора[1]:

· фрагментарны ўзровень: дзеці, якія знаходзяцца на гэтым узроўні, не могуць цэласна ўспрымаць твор, іх увага скіравана на асобныя фрагменты, а эмоцыі ад прачытанага часцей за ўсё не маюць слоўнага выражэння, абагульненні ад прачытанага адсутнічаюць;

· канстатуючы узровень: дзеці разумеюць змену настрояў у тэксце, але ім цяжка выказаць словамі свае пачуцці, аналіз прачытанага адбываецца праз пераказ эпізодаў, пры гэтым дакладна вызначаюцца матывы дзеянняў і ўчынкаў герояў твора;

· узровень “героя”: дзеці дакладна перадаюць свой эмацыйны стан ад прачытанага, мастацкія вобразы ўзнаўляюцца імі праз дэталі, даюцца адэкватныя ацэнкі дзеянням і ўчынкам персанажаў; з дапамогай наводзячых пытанняў дзеці здольны вызначыць аўтарскую пазіцыю; іх абагульненні па тэксце не выходзяць за межы пэўнага вобраза;

· узровень “ідэі”: чытачы здольны эмацыйна рэагаваць не толькі на падзеі, якія апісваюцца ў творы, а і на яго форму; яны маюць багатую фантазію і любяць перачытваць тэкст, абмяркоўваць яго, здольны вызначыць прызначэнне тых або іншых элементаў твора, іх абагульненні выходзяць за межы канкрэтных вобразаў.

Працэс рэцэпцыі мастацкага твора даследавала таксама Вольга Нікіфарава. Яна вылучае наступныя яго стадыі: непасрэднае ўспрыманне, г. зн. узнаўленне і перажыванне вобразаў твора; разуменне ідэйнага зместу; уплыў мастацкай літаратуры на асобу[2].

Пры падборы кніг для малодшых навучэнцаў важна ўлічваць, што дзіця ў працэсе ўспрымання мастацкага тво-

[1] Больш падрабязна гл. у наступнай крыніцы: Методические основы языкового образования и литературного развития младших школьников / Т.Г. Рамзаева [и др.]. М., 2003.

[2] Никифорова, О.И. Психология восприятия художественной литературы / О.И. Никифорова. М., 1972.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ра не размяжоўвае мастацкія і навукова-пазнавальныя творы, абедзве гэтыя групы разглядаюцца сінкрэтычна. Таму важна звяртаць увагу на спалучэнне пазнавальнага і выхаваўчага патэнцыялу таго або іншага твора. Дзіця, уважліва чытаючы твор, імкнецца заглыбіцца ў яго мастацкі свет, часам фізічна адчуваючы боль і пакуты героя, неаднойчы перажывае падзеі твора праз гульню, маляванне, лепку і г. д. У псіхалогіі гэта з'ява называецца "дзейснае ўяўленне", якое дае магчымасць пасля прачытання адпаведнага твора фантазіраваць з нагоды будучага лёсу яго герояў, будаваць іншыя схемы развіцця падзей і інш. Літаратурныя героі нярэдка ўспрымаюцца малым чытачом як жывыя людзі, часам сярод іх ён шукае сабе сяброў або ў працэсе гульні апранае маску пэўнага персанажа.

Для малодшых навучэнцаў важна моўная арганізацыя твора. Дзеці гэтага ўзросту, у адрозненне ад падлеткаў, шмат увагі надаюць мастацкім дэталям, дакладна перадаючы знешнасць літаратурнага героя, абставіны, у якіх ён дзейнічае, яго перажыванні. Маленькія чытачы ўжо здольны разумець дыялектычнасць вобразаў (у адной асобе могуць сумяшчацца станоўчыя і адмоўныя рысы) і адчуваць падтэкст. Таму пры падборы твораў для чытання важна ўлічваць сэнсавую аб'ёмнасць мастацкіх вобразаў і магчымасць дзіцяці ўступаць у сутворчасць з аўтарам.

Пры рабоце з мастацкім тэкстам на ўроках настаўніку трэба ўлічваць наступныя псіхалагічныя асаблівасці навучэнцаў:

а) патрэба ў гульнявой дзейнасці: літаратурны твор можа стаць пачаткам цікавай гульні, спосабам прыцягнення ўвагі да яго ў выглядзе інсцэніравання;

б) імкненне да пераймання, што з'яўляецца вялікім патэнцыялам для выхаваўчай работы, напрыклад, для фарміравання добрага эстэтычнага густу;

в) вострае эмацыйнае перажыванне прачытанага, што дае магчымасць фарміраваць эмпатыю (усвядомленае перажыванне эмацыйнага стану іншага чалавека); у працэсе чытання дзеці назапашваюць вопыт розных эмацыйных перажыванняў (страх, сум, радасць, расчараванне, захапленне і інш.);

г) патрэба ў знешніх уражаннях: дзіцячая кніга павінна быць добра ілюстраванай, знешне прывабнай.

Адным з самых любімых жанраў малодшых навучэнцаў з'яўляецца казка (фальклорная і літаратурная); таксама дзеці



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

шмат увагі надаюць прыгодніцкай літаратуры, апавяданням пра школьнае жыццё, пра сваіх аднагодкаў, пра навакольны свет. Акрамя таго, да кола дзіцячага чытання паступова далучаюцца кнігі энцыклапедычнага зместу, паэтычныя творы прыродаапісальнага, навучальнага характару.

У сучасных умовах цяжка пераацаніць патэнцыял беларускай дзіцячай літаратуры для выхавання і навучання. Педагогі прызнаюць, што эфектыўнасць адукацыйнага працэсу не ў малой ступені залежыць ад правільна падабраных для вывучэння твораў. Менавіта аналізу такіх твораў і прысвечаны дадзены вучэбны дапаможнік.

## Пытанні і заданні

1. Якое месца займае вучэбная дысцыпліна “Беларуская дзіцячая літаратура” ў падрыхтоўцы настаўніка пачатковай школы? Назавіце мэты і задачы гэтай дысцыпліны.

2. Выпішыце з тлумачальнага слоўніка беларускай мовы азначэнне паняцця “літаратура”. Вызначце, чаму гэтае паняцце не тоеснае паняццю “пісьменнасць”. Назавіце спецыфічныя рысы дзіцячай літаратуры.

3. Акрэсліце асноўныя этапы развіцця беларускай дзіцячай літаратуры.

4. Чым вызначаецца кола дзіцячага чытання для малодшага навучэнца на псіхалагічным, выхаваўчым, эстэтычным узроўнях?

5. Падбярыце як мага болей прыказак і прымавак, крылатых выслоўяў пра кнігі і ролю літаратуры ў жыцці чалавека.

6. Прыгадайце два мастацкія творы, якія найбольш запомніліся вам у розныя перыяды дзяцінства. Вызначце, чым яны прыцягнулі вашу ўвагу. Ці змяніліся з цягам часу адносіны да іх? Калі змяніліся, то акрэсліце сутнасць гэтых змен; калі ж ацэнкі твораў засталіся ранейшымі, то агучце іх, падмацаваўшы свае высновы адпаведнымі прыкладамі з твораў.

7. Напішыце эсэ[1] “Мая дзіцячая літаратура: любімыя тэмы, творы, вобразы”.

---

[1] Эсэ (франц. *essai* — спроба, вопыт, нарыс) — невялікае сачыненне ў адвольнай форме з сацыяльна-палітычнымі, маральна-філасофскімі ці літаратурна-эстэтычнымі праблемамі ў ім. “Для Э<сэ> характэрна падкрэсленая суб’ектыўнасць выказвання, свабодная кампазіцыйная структура твора. У ім празаічная мова нярэдка пераходзіць у вершаваную, само ж апавяданне падчас набывае выразную паэтычна-вобраз-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# Літаратура

## Асноўная

1. Алферов, А.Д. Психология развития школьников : учеб. пособие по психологии / А.Д. Алферов. Ростов н/Д, 2000.

2. Васілевіч, А. Люблю, хвалююся — жыву : нататкі, эсэ, роздум / А. Васілевіч. Мінск, 1986.

3. Вітка, В. Урокі : артыкулы, выступленні, нататкі / В. Вітка. Мінск, 1982.

4. Возрастная и педагогическая психология / М.В. Матюхина [и др.] ; под ред. М.В. Гамезо [и др.]. М., 1984.

5. Волков, Б.С. Возрастная психология. В. 2 ч. Ч. 2. От младшего школьного возраста до юношества / Б.С. Волков, Н.В. Волкова ; под ред. Б.С. Волкова. М., 2005.

6. Методические основы языкового образования и литературного развития младших школьников / Т.Г. Рамзаева [и др.]. М., 2003.

7. Миронов, А. Дед Мавр : повесть-воспоминания / А. Миронов. Минск, 1983.

8. Никифорова, О.И. Психология восприятия художественной литературы / О.И. Никифорова. М., 1972.

9. Рагойша, В. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах : дапаможнік / В. Рагойша. Мінск, 2001.

10. Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне "Беларуская дзіцячая літаратура" прафесіянальнага кампанента тыпавога вучэбнага плана па спецыяльнасці 2-01 02 01 "Пачатковая адукацыя" для рэалізацыі адукацыйнай праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй / І.Г. Лабёнак. Мінск, 2014.

11. Якімовіч, А. Збор твораў. У 3 т. Т. 3. Апавяданні, казкі, аўтабіяграфія / А. Якімовіч. Мінск, 1980.

## Дадатковая

1. Антонава, Н.У. Праца з мастацкім тэкстам пры навучанні чытанню малодшых школьнікаў / Н.У Антонава // Пачатковая школа. 2008. № 5. С. 2–6.

2. Берхин, Н.Б. Литературное развитие школьников / Н.Б. Берхин. М., 1989.

---

ную афарбоўку, афарыстычную сціласць і трапнасць" (гл. Рагойша, В. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах : дапаможнік / В. Рагойша. Мінск, 2001. С. 368).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

3. Буторына, Т.А. Літаратурныя зярняткі, або развіццё творчых здольнасцей маленькага чытача : дапаможнік / І.А. Буторына. Мінск, 2012.

4. Вітка, В. Дзеці і мы / В. Вітка. Минск, 1977.

5. Гриценко, З.А. Детская литература. Методика приобщения детей к чтению / З.А. Гриценко. М., 2004.

6. Кучко, Д.В. Творчыя прыёмы працы над казкай на ўроках літаратурнага чытання / Д.В. Кучко // Пачатковае навучанне : сям'я, дзіцячы сад, школа. 2013. № 1. С. 62–64.

7. Лазарук, М.А. Навучанне і выхаванне творчасцю : педагагічныя роздумы і пошукі / М.А. Лазарук. Мінск, 1994.

8. Светловская, Н.Н. Обучение детей чтению : детская книга и детское чтение / Н.Н. Светловская, Т.С. Пиче-оол. М., 1999.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова